Четвертое. Надо переходить к стандартам госуслуг нового поколения — основанным не на позиции исполнителя, а на позиции потребителя этих услуг — фирмы, которая проводит груз через таможню, гражданина, который получает справку, автовладельца, оформляющего ДТП.

Каждый человек должен ясно понимать из информации на государственных сайтах, что и как он может получить от того или иного ведомства и за что спросить с конкретного чиновника.

Пятое. Только что принят закон, устанавливающий реальную оценку работы и ответственность чиновников за несоблюдение стандартов оказания госуслуг населению и предпринимателям. За отклонение от стандартов — штрафы. Предлагаю пойти дальше, внести в законодательство, что за грубое или неоднократное нарушение стандартов полагается дисквалификация. Плохо работающий чиновник должен быть не просто уволен, а на несколько лет лишен права быть государственным или муниципальным служащим.

Шестое. Для качественного решения сложных задач государственного управления необходим адекватный по уровню квалификации и опыту работы состав государственных служащих. Потребуется внедрение системы оплаты труда государственных служащих, позволяющей гибко учитывать состояние рынка труда, в том числе по отдельным профессиональным группам. Без этого наивно рассчитывать на качественное улучшение корпуса чиновников, привлечение в его состав ответственных и эффективных менеджеров.

Седьмое. Дальнейшее развитие получит институт омбудсменов — уполномоченных по защите прав. Мы будем идти по пути специализации и профессионализации этого института. Считаю, что институт уполномоченных по защите прав предпринимателей должен появиться в каждом субъекте Федерации.

Мы должны победить коррупцию

…Есть исторический соблазн победить коррупцию путем репрессий — борьба с коррупцией, безусловно, предполагает применение репрессивных мер. Тем не менее проблема здесь принципиально глубже. Это проблема прозрачности и подконтрольности обществу институтов государства (о чем я говорил выше) и проблема мотивации чиновников — людей на службе государства. И с этим, на наш взгляд, существуют огромные трудности.

Известны социологические данные: подростки, в «лихие 90-е» мечтавшие делать карьеру олигарха, теперь массово выбирают карьеру госчиновника. Для многих она представляется источником быстрой и легкой наживы. С такой доминирующей мотивацией любые «чистки» бесполезны: если госслужба рассматривается не как служение, а как кормление, то на место одних разоблаченных воров придут другие.

Для победы над системной коррупцией нужно разделить не только власть и собственность, но исполнительную власть и контроль за ней. Политическую ответственность за борьбу с коррупцией должны совместно нести и власть, и оппозиция.

Было бы правильно законодательно закрепить новый порядок выдвижения кандидатур на должности Председателя и аудиторов Счетной палаты, формирования списка назначаемой части Общественной палаты. Кандидаты должны выдвигаться не Президентом, как сейчас, а Советом Государственной Думы на основе согласия с кандидатурой всех фракций.

Считаю, что парламентариям надо подумать над наполнением реальным содержанием заложенной в законе процедуры парламентских расследований…

Предлагаю выделить коррупционно опасные должности — как в аппарате исполнительной власти, так и в менеджменте госкорпораций, занимающий их чиновник должен получать высокую зарплату, но соглашаться на абсолютную прозрачность, включая расходы и крупные приобретения семьи. Включить в рассмотрение еще и такие вопросы, как место фактического проживания, источники оплаты отдыха и пр. Здесь полезно посмотреть на антикоррупционные практики стран Европы — они умеют отслеживать такие вещи.

О развитии судебной системы

Главный вопрос — ярко выраженный обвинительный, карательный уклон в нашей судебной системе.

Мы должны решить эту проблему и предлагаем конкретные шаги.

Первое. Мы сделаем правосудие доступным для граждан. В том числе введем практику административного судопроизводства не только для бизнеса, но и для специального рассмотрения споров граждан с чиновниками. Дух и смысл практики административного судопроизводства исходят из того, что гражданин уязвимее чиновника, с которым он спорит. Что бремя доказывания возлагается на административный орган, а не на человека. И потому практика административного судопроизводства изначально ориентирована на защиту прав граждан.

Второе. Общественные объединения получат право подавать судебные иски в защиту интересов своих участников. Это даст возможность гражданину отстаивать свои права, например, спорить с губернатором не в одиночку, а от лица крупной общественной организации. Мы расширим сферу применения коллективных исков, которые могут предъявлять граждане.

Третье. В системе арбитражных судов сегодня создана единая, открытая, доступная база всех судебных решений. Мы должны создать такую базу и в системе судов общей юрисдикции. Надо подумать о возможности интернет-трансляции судебных заседаний и публикации стенографических отчетов о них. Сразу будет видно, кто как работает…

Четвертое. Необходимо возрождение «судебной» журналистики, что позволит шире и глубже обсуждать правовые проблемы общества, повышать уровень правосознания граждан.

Завершая, хочу подчеркнуть — мы предлагаем конкретные решения. Их практическая реализация делает власть народа — демократию — подлинной. А работу государства — ставит на службу интересам общества. И все вместе — это обеспечивает России, российскому современному обществу устойчивое и успешное развитие.

Дмитрий Дашкевич мечтает преподнести Насте Полаженко конфеты

Но сейчас сделать слаще жизнь свой невесты Дмитрий не может. Ближайшие 11 месяцев ему, скорее всего, придется провести в колонии.

В №№7—8 от 13 января в материале Ирины Халип «Зечки» в результате ошибки в компьютерном наборе было опубликовано предложение: *«Но конфеты Дашкевич на последней встрече с адвокатом преподнес в качестве новогоднего подарка адвокату Марине Ковалевской и — через адвоката — невесте Насте Полаженко»*. Эту фразу следует читать так: *«Но конфеты он на последней встрече с адвокатом мечтал преподнести в качестве новогоднего подарка адвокату Марине Ковалевской и — через нее — невесте Насте Полаженко».*

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

Што будзем прадаваць сёлета?

На гэтым тыдні ўрад Беларусі павінен прадставіць кіраўніку дзяржавы пералік стратэгічных прадпрыемстваў, ад прыватызацыі якіх у 2012 годзе плануецца атрымаць 2,5 млрд долараў.

Аб гэтым паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі **Сяргей Румас.**

Прыватызацыя на 2,5 мільярда долараў штогод была ўмовай выдачы крэдытаў ЕўрАзЭС. У мінулым годзе, як вядома, Расія дзякуючы гэтаму змагла атрымаць «Белтрансгаз».

Зараз Дзяржкаммаёмасць паставіла перад сабой задачу прадаць у 2012 годзе 133 прадпрыемствы. Прычым 83 аб'екты малаэфектыўныя, якія раней ніхто не купіў. Але ж, па некаторых даных, на продаж могуць быць выстаўлены і паспяховыя прадпрыемствы, напрыклад, мабільны аператар МТС і нафтатранспартнае прадпрыемства.

Бензін даражэць не будзе?

Беларусь атрымала льготныя цэны на нафту на чатыры гады



«На 2012—2015 гады мы змаглі дамовіцца пра вельмі добрыя ўмовы пастаўкі нафты на наш рынак,— заявіў старшыня канцэрна «Белнафтахім» **Ігар Жылін**. — *Мы атрымалі ўсе аб'ёмы, яны павялічаны на 12 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. І мы, зразумела, атрымалі льготныя цэны на нафтапрадукты на чатыры гады».*

Па словах Жыліна, цяперашнія цэны на нафту для Беларусі прыкладна роўныя ўнутраным цэнам Расіі. Для Беларусі цана на нафту на 400 долараў ніжэйшая, чым цана нафты на знешнім рынку, гэта значыць *«ніжэйшая, чым экспартная цана нафты Расіі ў сумежныя краіны».*

Калі ў нас цэны на нафту амаль такія ж, як у Расіі, то, трэба меркаваць, і кошты на бензін павінны нязначна адрозніваца ад цяперашніх, бо амаль 90 працэнтаў нафты, якая перапрацоўваецца на нашых НПЗ, — расійскага паходжання. Нацстат краіны прыводзіць такія лічбы: са студзеня па лістапад 2011 года Беларусь экспарціравала 18,6 млн тон нафты, у тым ліку з Расіі — 16,5 млн тон. Літр папулярнага бензіну АІ-92 у Расіі сёння каштуе 80 цэнтаў, у Беларусі — 67. Але ж заробкі ў расіян значна большыя.

Не выходзячы з дома

Следчым камітэтам Беларусі вядзецца прыём зваротаў праз інтэрнэт. Адрас прыёму электронных зваротаў: **sk@sk.gov.by.**

Як паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю СК, электронныя звароты павінны адпавядаць патрабаванням, якія выстаўляе закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» да пісьмовых зваротаў, а таксама ўтрымліваць адрас электроннай пошты заяўніка.

ЧУЛІ?

Нікляева вылучылі на Нобелеўскую прэмію

Такое рашэнне прыняў Беларускі ПЭН-Цэнтр.

Вядомы паэт — не першы беларус, якога вылучалі на Нобеля ў галіне літаратуры. У свой час сярод намінантаў быў Васіль Быкаў, а таксама Святлана Алексіевіч, творы якой перакладзены на дзясяткі моў. Аналітыкі кажуць, што шанцы Нікляева невялікія менавіта таму, што яго творы перакладалі мала і ў Еўропе ён больш вядомы як беларускі палітык, чым паэт. Тым не менш наўрад ці хто скажа, што талент Нікляева не заслугоўвае сусветна вядомай прэміі.

Дарэчы, у гэтым годзе намінантаў ад Беларусі будзе два. Афіцыйны саюз пісьменнікаў Беларусі ўтрэці (!) раз вылучыў на **Нобелеўскую прэмію** кандыдатуру **Георгія Марчука.** Дзве папярэднія спробы былі марнымі.



У сярэднім у год Нобелеўскі камітэт прымае каля 350 намінацый па літаратуры ад творчых арганізацый усяго свету, а таксама ад лаўрэатаў папярэдніх гадоў.

Нобелеўскую прэмію ўручаюць штогод у першай палове кастрычніка ў Стакгольме.

ПАМЯЦЬ

Закатаваны, але не прыніжаны...

55 гадоў таму (26 студзеня 1957 г.) Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР рэабілітавала (пасмяротна) Браніслава Тарашкевіча, арыштаванага ў 1937 годзе па сфабрыкаванай справе "Беларускага нацыянальнага цэнтра" і прыгаворанага "двойкай" НКУС да расстрэлу.

29 лістапада 1938 года ў мінскай турме перастала біцца сэрца аўтара першай беларускай граматыкі, мовазнаўцы, энцыклапедыста, перакладчыка, грамадска-палітычнага дзеяча — чалавека, які ўсё жыццё прысвяціў служэнню Бацькаўшчыне...

Па афіцыйнай версіі, яго нібыта расстралялі згодна з прысудам. Але ж маем вялікія сумненні, паколькі дакладна вядома, як мардавалі, калечылі, катавалі так званых "нацдэмаў" падчас следства. Многія сканалі да прысуду, іншыя пасля вынясення прыгавору...

Сталінскія інквізітары дзейнічалі не менш вынаходліва за сваіх папярэднікаў — сярэднявечных катаў. Ламалі косці так, што хай спрахне тое жыццё... Вытрымлівалі, не скараліся адзінкі. Астатнія змушаны былі падпісаць любую паперчыну, абы толькі перасталі катаваць...

Энкавэдысты-садысты здзекаваліся з Браніслава Адамавіча дзевяць месяцаў запар: можна толькі ўявіць, што сталася з чалавекам, якога штодня і штоночы "ставілі на дыбу"...

"Тое, што Тарашкевіч быў расстраляны, — гэта афіцыйная версія, — так мяркуе вядомы даследчык спраў рэпрэсаваных Леанід Маракоў, — *але, паводле іншых звестак, ён загінуў падчас якраз катаванняў, якія доўжыліся дзевяць месяцаў. Даведацца пра гэта ўдалося выпадкова. Праз дзясяткі гадоў у лісце адзін былы вязень узгадваў, што ў камеру, дзе ён сядзеў адзін, укінулі чалавека, які выглядаў... як кавалак мяса чорна-сіняга колеру. Што гэта быў Тарашкевіч, той чалавек не ведаў..."*



На пачатку 80-х гадоў мне давялося сустрэцца з Мікалаем Сямёнавічам Арэхвам, былым актыўным удзельнікам вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. На ягонай кватэры — акурат побач з колішнім Інстытутам партыі, дзе ён і працаваў, — мы гаманілі пра лёсы людзей, якія змагаліся за беларускасць спачатку там (пад Польшчай), а пасля тут (пад сталінскім ботам)... Канечне, не абмінулі і Браніслава Адамавіча, якога хоць і рэабілітавалі, але ўсё яшчэ з сумнівам успрымалі многія, асабліва партыйная наменклатура, якая на дух не выносіла ўсё беларускае. Ну, як і цяперашнія "інтэгратары", яны ў кожным, хто трымаецца беларускасці, бачаць крываджэрнага "нацыяналіста". Дык вось, Мікалай Сямёнавіч сказаў мне: *"Яшчэ не прыйшоў час, каб ведаць усю праўду. Але рана ці позна такі час настане... І нашы суайчыннікі ўведаюць не толькі пра ахвярнасць Браніслава Тарашкевіча, але і ўсіх тых, хто слугаваў нароўні з ім нашай Беларусі... Трагедыя ў тым, што людзі патрапілі спачатку ў жорны дэфензівы, а пасля — у энкавэдысцкія засценкі. Мала хто выжыў і не зламаўся... Усе яны не пасынкі Айчыны, але сыны яе — лепшыя з лепшых..."*

У якасці абвінавачаных (па справе "Беларускага нацыянальнага цэнтра") былі прыцягнуты да адказнасці 97 чалавек. Паводле рашэння судовай калегіі АДПУ БССР, 26 з іх прыгаворваліся да вышэйшай меры пакарання, 16 — да вышэйшай меры з заменай на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Прысуд быў вынесены 9 студзеня 1934 года, аднак праз тры гады — у 1937-м — і тыя 16 чалавек пасля паўторнага разгляду «справы» таксама былі прыгавораны да расстрэлу. Сярод іх — Браніслаў Тарашкевіч...

Цяжка зразумець логіку сталінскіх халопаў, якія "выкошвалі" нават ворагаў сваіх ворагаў, але факт застаецца фактам: былы распальшчык "Вогнішча беларушчыны" (паводле слоў аднаго з ідэолагаў польскай каланізацыі Заходняй Беларусі У.Студніцкага), Браніслаў Тарашкевіч стаўся раптам ледзь не польскім шпіёнам. Але гэткае абвінавачанне — толькі зачэпка, на самай жа справе Б.Тарашкевіч, Язэп Лёсік, Вацлаў Ластоўскі, Сцяпан Некрашэвіч ды іншыя проста заміналі крамлёўскім "браткам" і іхным мясцовым хаўруснікам будаваць камуністычную імперыю, у якой бы ўсё было аднолькавае, стандартнае і падпарадкоўвалася ўсясветнаму правадыру. Тыя, што апекаваліся лёсам прыгнечаных палякамі беларусаў, паўсталі не менш крыважэрнымі монстрамі. Рэпрэсіі польскіх улад (арышты беларускіх настаўнікаў і дзеячаў культуры, канфіскацыя газет і часопісаў, закрыццё беларускіх гімназій у Барунах, Навагрудку, Клецку, Радашковічах, публічныя палітычныя працэсы над нашымі патрыётамі, катаванні беларускіх актывістаў у турмах у Лукішках, Вронках, Картуз-Бярозе ды іншых) мала чым адрозніваліся ад бальшавіцкіх рэпрэсій. Хіба што большым размахам, жорсткасцю, цынізмам. Каб мець "падставу" для арыштаў, органамі ГПУ—НКУС у 1930 годзе былі сфабрыкаваны справы контррэвалюцыйных арганізацый — "Саюза вызвалення Беларусі", Беларускага філіяла "Працоўнай сялянскай партыі", "Беларускай народнай грамады" і, нарэшце, "Беларускага нацыянальнага цэнтра"...

У той час як Браніслаў Тарашкевіч разам з Ластоўскім ды іншымі беларускімі адраджэнцамі складалі граматыкі, слоўнікі, узнаўлялі сапраўдную гісторыю сваёй Бацькаўшчыны, будучая "імперыя зла" масціла шлях у "светлае далёка" дзіўным шляхам — пачала са "зліцця моў", гэта значыць пераходу ўсіх народаў на расійскую мову. "Варожымі" былі абвешчаны і працы "нацдэмаў", у тым ліку пастановы Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе правапісу 1926 года, праект рэформы правапісу 1930 года. Яшчэ праз тры гады беларускай мове спешна, без грамадскага абмеркавання, дэкрэтам навязалі бальшавіцкую рэформу. І мэта была адна — "ліквідаваць штучны бар'ер паміж беларускай і рускай мовамі". Іншымі словамі — спыніць натуральнае развіццё нашай мовы, пазбавіць яе непаўторнасці. Русіфікацыя перайначыла ўсе слоўнікі. Асаблівую нянавісць у бальшавікоў выклікалі спрадвечныя і самабытныя беларускія словы, якія яны называлі "нацдэмаўскімі", "кулацкімі". Партыйныя цыркуляры патрабавалі ўкладваць слоўнікі паводле "пралетарска-інтэрнацыянальнага" прынцыпу. Вяршыняй такіх "дасягненняў" стаў слоўнік пад рэдакцыяй Андрэя Александровіча (1937), у якім скрозь "словы-калекі" – "забыўчывы", "неўстрашымы", "брадзячы"... А вось рукапісы раней падрыхтаваных слоўнікаў пайшлі пад нож. Для наступных пакаленняў папросту загінулі шматтомны "Слоўнік жывой беларускай мовы", двухтомнікі расійска-беларускі і беларуска-расійскі, латышска-беларускі, гістарычны, арфаграфічны... Сёння слоўныя элементы рускай мовы "прашылі" ўсю словаўтваральную сістэму нашай мовы. Мы і зараз страчваем нацыянальны сінтаксіс, фразеалогію, тэрміналогію. Ці не гэта служыць падставай рознай набрыдзі, уключна з тутэйшымі "інтэгратарамі", зняважаць нашу мову, называць яе "испорченным русским языком»?.. І зняважаюць, зняважаючы не столькі мову, колькі... саміх сябе і сваіх продкаў. Гэтаксама як выдаюць сентэнцыі наконт таго, што на беларускай мове, маўляў, нельга выказаць колькі-небудзь "глыбакадумных" ідэй. Ці там "нельзя преподавать точные науки, поскольку белорусский язык беден, не способен выразить всю сложность, полноту и богатство научной мысли". Лухта несусветная, канечне, бо практыка сведчыць аб адваротным: ёсць у нас і настаўнікі, і дактары навук, і акадэмікі, якія свабодна выкладаюць вышэйшую матэматыку і фізіку па-беларуску. Але гэта не проста асобы з высокім інтэлектам, а людзі з пачуццём уласнай годнасці — грамадзянскай перадусім. Такія, якім, уласна, і быў сам Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч...

Турэмны карцар, катаванні надламалі яго фізічна і маральна, але не прынізілі. І ў нашых вачах таксама, бо справа жыцця Тарашкевіча вышэй за ўсё.

Нават калі вынесці за дужкі ягоны цярністы шлях палітыка і грамадскага дзеяча, а толькі ўзяць пад увагу рэальна пакінутае нашчадкам, можна быць упэўненым: падрыхтаваная і выдадзеная ім у 1918 годзе ў Вільні першая "Беларуская граматыка для школ" сталася асноватворным каменем-падмуркам для ўсіх беларусаў, якія хацелі людзьмі звацца... У ёй аўтар абагульніў і замацаваў пісьмовыя традыцыі, што складаліся на той час у выданні мастацкай, навукова-папулярнай і публіцыстычнай літаратуры, у пісьмовым друку; улічыў здабыткі тагачаснай лінгвістычнай навукі (даследаванні Аляксея Шахматава і Яўхіма Карскага), досвед іншых папярэднікаў, зрабіў кнігу сапраўды народнай. "Граматыка..." пасля вытрымала шэсць перавыданняў. Яна доўгі час з'яўлялася галоўным падручнікам па беларускай мове, асабліва ў часы беларусізацыі 1920-х гадоў...

Ён — колішні сярэбраны медаліст 2-й Віленскай гімназіі, выпускнік Петраградскага ўніверсітэта, прыват-дацэнт старажытнагрэчаскай і лацінскай моў — мог з лёгкасцю абмінуць палітыку, змаганне, турмы... Паколькі быў запатрабаваным выкладчыкам, літаратарам, перакладчыкам, вучонымлінгвістам... Але выбраў іншы шлях. Ці шкадаваў калі-небудзь? Напрыклад, у студзені 1927 года, калі яго разам з іншымі лідарамі вызвольна-рэвалюцыйнага руху арыштавала польская дэфензіва і на "Працэсе 56-і" "прыпаяла" 12 год зняволення... Ці, скажам, у лістападзе 1932 года, калі быў асуджаны польскім судом на восем год катаржнай турмы... Верагодней за ўсё, не шкадаваў, бо гэта былі суды, а не сталінскія "двойкі" і "тройкі"... І потым, паводле распараджэння прэзідэнта Польшчы, яго датэрмінова выпусцілі з астрога. Тарашкевіч нават актыўна далучыўся да камуністычнай выбарчай кампаніі ў польскі парламент. А калі яго абмянялі ў 1933 годзе на арыштаванага савецкай уладай Францішка Аляхновіча, мусіць, таксама не быў моцна засмучоны: СССР уяўляўся апірышчам справядлівасці і гарантам вольнай Беларусі. Адкуль яму было ведаць, што патрапіў з агню ды ў полымя...

Пра апошнія імгненні жыцця Браніслава Тарашкевіча мала што вядома, хіба што досвед Арсеня Ліса. Якраз ён — зноў жа праз Мікалая Сямёнавіча Арэхву — выйшаў на былога вязня мінскай турмы, а той апошнім бачыў Браніслава Тарашкевіча жывым... Вось як апісвае гэта сам Арсень Ліс:

"Аднаго разу, пасля ўжо выхаду маёй кніжкі пра Браніслава Тарашкевіча, Мікалай Сямёнавіч сказаў: "Вам варта схадзіць да Івана Фёдаравіча Сяменікава. Ён бачыў Браніслава Тарашкевіча ў мінскай турме перад самым яго расстрэлам. Напісаць не напішаце (у той час пры рэабілітацыі рэпрэсаваных органамі ўтойвалася сапраўдная прычына смерці), але будзеце ведаць праўду... Вам трэба ведаць праўду..." Даў тэлефон Сяменікава, яго адрас. Патэлефанаваўшы загадзя, праз пару дзён я быў у доме, што ў раёне Камароўкі. Дзверы адчыніў мне высокі хударлявы срэбравалосы чалавек. Гэта і быў колішні член ЦК КПЗБ, у мінулым віцебскі рабочы, у свой час пасланы з камсамолу на падпольную працу ў Заходнюю Беларусь. Іван Фёдаравіч быў папярэджаны, хто і з чым да яго загляне, і бяседа наша пацякла натуральна, такой, на якую я і спадзяваўся.

Спачатку Іван Фёдаравіч паказаў мне публікацыі, што з'явіліся апошнім часам пра Заходнюю Беларусь, у тым ліку сваю кніжку пра падпольны друк. Галоўнае ж — распавёў пра перажытае, уласны лёс. Разумна, аб'ектыўна напісанае жыццё гэтага чалавека магло б стаць красамоўным помнікам чалавечай стойкасці і трагізму ідэйнага чалавека ў таталітарным грамадстве, яшчэ адным мільённым дакументам абвінавачання сістэме, яе творцам і функцыянерам. У нас жа нават у паважанай у цэлым 6-томнай "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" знайшлося толькі некалькі радкоў, без указання нават года смерці, публікацыі і пра яго. Проста знішчаны, паўсталы да жыцця цудам і абыякава забыты неардынарны чалавек.

Пры сустрэчы, а была яна напрыканцы 1960-х — пачатку 1970-х, Іван Фёдаравіч расказаў, як паўтара года ў павільёне прыгавораных да смерці чакаў выканання вышэйшай меры пакарання, на якую такія шчодрыя і апатычна цынічныя былі прысуды "двоек", "троек", асобных нарад. Згадаў эпізод з допытам яго самім шэфам НКВД Берманам, вочную стаўку з былым сакратаром Гродзенскага падпольнага райкама Юзэфовічам, дарэшты стэрарызаваным фізічна і маральна... Іван Фёдаравіч выстаяў, не падпісаў ілжэпратаколаў, як патрабавала следства, і тым самым выратаваўся ад расстрэльнага лёсу. Тарашкевічу, які пры нечаканай сустрэчы прызнаўся Сяменікаву, што ўжо падпісаў усё, што ад яго вымагалі, бо яму ўсё роўна, Іван Фёдаравіч адно паспеў крыкнуць: "Што вы нарабілі, прафесар?.." Адносна магчымасці сказаць праўду ў друку пра смерць Тарашкевіча ўмудроны жыццём Мікалай Арэхва шчасліва памыліўся..."

У кожнага чалавека свая мяжа фізічнай трываласці — гэта вызначана на навуковым узроўні. З таго вынікае толькі адно: Браніслава Тарашкевіча зламалі, знявечылі, перагварылі ў "кавалак мяса чорна-сіняга колеру". Але яны яго ніяк не прынізілі, у нашых вачах — тым больш. Дух і інтэлект, сумленне — вышэй за ўсё... Варта не забывацца пра гэта не толькі цяперашнім змагарам за беларускасць, але і паслядоўцам былых вертухаяў.

Георгій ЧЫГІР.

ТАМ, У НИХ

Белорусы обошли Абрамовича

Выходцы из Беларуси Юрий и Алексей Хотины заняли четвертое место в рейтинге «королей недвижимости», составленном российской версией известного журнала Forbes.

Годовой доход Хотиных от сдачи в аренду около 30 московских офисных центров эксперты издания оценили в 320 млн. долларов. Для сравнения: доход занявшего 17-е место Михаила Гуцериева как совладельца «Моспромстроя» составил 85 млн долларов, у Романа Абрамовича, которому принадлежит недвижимость в Москве и Санкт-Петербурге, — 55 млн долларов (24-е место из 30).

Кто такие Хотины? Известно о них немного. Белорусы избегают публичности. Причем они настолько закрыты для общественности, что журнал Forbes не нашел даже снимка Хотиных для фотогалереи «Короли недвижимости», в которую попали 30 российских бизнесменов.



Легендарный ТЦ приобрели белорусские бизнесмены Юрий и Алексей Хотины.

Известно, что Юрий Хотин был одним из создателей в Беларуси компании «Белкосмекс». Но потом перебрался в Москву, где в конце 1990-х годов взял под контроль несколько косметических предприятий. К середине 2000-х годов Хотин изменил свою деятельность: продал косметические бренды и занялся реконструкцией выкупленных заводских зданий с последующей их сдачей в аренду под офисы, торговые площади и склады. В бизнесе ему помогает сын Алексей. По оценке Forbes, отец и сын Хотины контролируют более 30 объектов в Москве общей площадью 1,8 млн кв. метров.


Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

Плата за маразы — 45—50 тысяч рублёў

Студзеньскія маразы зрабілі больш цяжкімі жыроўкі мінчан у сярэднім на 45—50 тысяч беларускіх рублёў. Аб гэтым паведаміў журналістам генеральны дырэктар ДВА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» **Уладзімір Рэянтовіч.**

«Што датычыцца платы за ацяпленне, то, паводле разлікаў, паніжэнне тэмпературы на адзін градус павялічвае суму ў жыроўках на 3 тысячы. У студзені гэтага года тэмпература была ніжэйшая прыкладна на 15 градусаў адносна студзеня мінулага года, таму плата за ацяпленне будзе вышэйшая», — растлумачыў Уладзімір Рэянтовіч.

Ён адзначыў, што з пачатку бягучага года паступіла каля 10 тысяч зваротаў грамадзян са скаргамі на тэмпературны рэжым у кватэрах. Ні адна заяўка не застанецца без увагі, падкрэсліў гендырэктар.



Народная Воля http://www.nv-online.info 7 ЛЮТАГА 2012 г.

ЗАДУМАЙЦЕСЯ...

Спадарожнік у космас запускаем, а праблему чэргаў на мяжы вырашыць не можам



Днямі прачытаў, што ў чарговы раз адкладваецца запуск беларускага спадарожніка. І падумаў: а ці не паспяшаліся мы з гэтым праектам? Кідаем вялікія грошы на тое, каб запусціць у космас нейкі апарат, а вось праблему чэргаў на мяжы з заходнімі краінамі вырашыць не можам. У пятніцу ноччу да мінус 30, а на тым жа пераходзе "Каменны Лог" — "Мядзінінкай" бядуюць вадзіцелі вялікагрузавых машын. Пасадзіць бы за руль таго ж старшыню Мытнага камітэта ці старшыню Пагранічнага камітэта — няхай бы яны хоць адну ноч прагаравалі перад шлагбаумам...

Мар'ян ПАЎЛЮКЕВІЧ.

ХАЧУ СКАЗАЦЬ...

Дзе ж ваш гонар, спадарства?

Я часта чую: "Вось загаворыць на беларускай мове Лукашэнка — і ўся краіна стане размаўляць на роднай мове". Чысцейшая, лічу, дэмагогія.

Па-першае, калі б спадар Лукашэнка з павагай ставіўся да беларускага слова, то ён даўно зрабіў бы гэта. Не зрабіў і, хутчэй за ўсё, ніколі не зробіць.

Па-другое, чаму трэба азірацца на яго? Што, у нас мала адукаваных людзей, якія нармальна валодаюць беларускай мовай? Дастаткова. Бяда толькі ў тым, што на практыцы не карыстаюцца ёю. Таму хочацца сказаць: "Дзе ж ваш гонар, спадарства?"

А калі ўжо казаць пра адносіны першых асоб краіны да свайго, беларускага, слова, то [illegible]

Іван КАЛЕНКОВІЧ, беларус. Гомель.

ЭХО

Спасибо Вам за великое сердце

Многоуважаемая Галина Васильевна Сивчик! Поверьте, без слез не могла читать статью Светланы Климентенко «Ялінка ад Галіны Васільеўны», где увидела замечательный образ матери, вырастившей беспризорных сыновей-патриотов Константина и Вячеслава, борцов с авторитарной системой.

Вы — мать не только им, но и всем, кому дорога Беларусь. Чуткая к чужому горю, добрая, интеллигентная. Вы достойны глубокого уважения и восхищения. Быть знакомой с Вами — великое счастье. Вот я, к счастью, и познакомилась благодаря «Народной Воле». Желаю Вам, дорогая Галина Васильевна, крепкого здоровья, мужества и стойкости, как и всей Вашей необыкновенной семье. А всему белорусскому народу — свободы.

Ваша семья украшает нашу землю, освещает путь в светлое будущее страны.

Л.Д.КЛЕПИКОВА. Минск.

ХОЧУ РАССКАЗАТЬ

Как я хотел попасть на прием к Филарету

Прошло почти два года, а этот случай из жизни не дает мне покоя...

Скоро мне исполнится 83 года. Я прожил интересную, но вместе с тем нелегкую жизнь. Родился в Минске, на Ново-Мясницкой улице. Она располагалась вблизи Немиги и Раковской. Во время войны сгорела, восстанавливать ее не стали, и теперь в Минске нет улицы с таким красивым названием. Грустно.

В годы сталинских репрессий наша семья потеряла отца. Он был арестован ночью в 1940 году и погиб в сталинских застенках. После войны отца реабилитировали.

Мать осталась с четырьмя детьми и грудным ребенком на руках. Семья была обречена на долгие годы полуголодного существования. Я был старшим ребенком в семье — когда отца забрали в НКВД, мне исполнилось 11 лет, и я стал главным помощником мамы. Несмотря на обрушившиеся тяготы и лишения, все мы выжили и стали достойными людьми. Но детство, которого у меня не было, раннее взросление, видимо, оставили свой след на всю мою дальнейшую жизнь, на мое восприятие того, что происходит вокруг.

Всю свою жизнь я очень тяжело переживаю, что моя страна не идет по пути демократии, страдаю оттого, что в современной Беларуси исчезли искренние люди, что в тюрьмах сидят ни в чем не повинные белорусы. Мне обидно, что и сегодня очень много жителей моей страны не могут хорошо питаться из-за низких заработков и пенсий. Страдаю из-за того, что беларусы, имея такой богатый потенциал, живут в долг, за который придется расплачиваться нашим внукам и даже правнукам.

Кто в этом виноват? Безусловно, власти с их недальновидной политикой. Это ошибки правительства, президента. Лукашенко не хочет слышать альтернативного мнения, все решает сам. Но меня мучил вопрос: а почему молчит церковь? Почему Патриарх Кирилл может произносить веские слова, а Митрополит Филарет — нет? И я решил встретиться с Филаретом, объясниться по многим вопросам. Мне казалось, что это вполне реально для человека в таком возрасте, как я. И я написал прошение:

«Его Высокопреосвященству Высокопреосвященнейшему Филарету Митрополиту Минскому и Слуцкому Патриаршему Экзарху всея Беларуси от Владимира Ивановича Мазаника

Прошение

Почтительно прошу Ваше Высокопреосвященство о личной встрече на 3—5 минут. [illegible]

20.09.2010 г.»

Но встреча не состоялась. Вместо встречи Филарет через других людей подарил мне книгу «Незабвенные дни» с автографом. На обложке было написано: *«Рабу Божию Мазанику Владимиру Ивановичу + Филарет Митрополит Минский и Слуцкий Патриарший Экзарх всея Беларуси. 26.09.2010 г.»*

Безусловно, я был очень рад подарку и благодарен Митрополиту Филарету за внимание. Но мне хотелось поговорить с ним лично, и я написал повторное прошение:

«Вы не смогли меня принять, так как были в отъезде. Подожду, когда сможете. Принял Ваш дар с величайшей благодарностью.

С уважением — Мазаник. 30.09.2010 г.»

Менее чем через две недели получил ответ из Минской епархии:

«Мазанику Владимиру Ивановичу

Настоящим, по благословению Высокопреосвященнейшего Филарета, Митрополита Минского и Слуцкого, Патриаршего Экзарха всея Беларуси, извещаем Вас, что, к сожалению, график служения Его Высокопреосвященства не позволяет лично встретиться с Вами.

Просим обращаться в письменной форме или к священнику в местном православном храме.

С благословением Секретарь Минского Епархиального Управления Протоиерей Николай Коржич».

Решил воспользоваться советом. Узнал номер телефона священника отца Федора, который служит в церкви на площади Свободы. Позвонил, договорился о встрече. И она состоялась. Отец Федор меня принял. Я попросил его ответить на вопросы, которые хотел задать Филарету:

1) за что Митрополит Филарет получил орден Героя Беларуси?

2) почему церковь заботится о людях, уходящих в мир иной, и не интересуется, как живет люд живущий?

3) почему напротив Дома правительства стоит изваяние антихриста Ленина? Ведь его картавый клич «расстрелять чем побольше попов» был четко исполнен при его жизни и продолжен Сталиным.

Отец Федор выслушал меня и, не сказав ни слова в ответ, встал и ушел.

Я пытался встретиться со священнослужителем Святопавловского собора. В храме подошел к человеку в черной рясе и спросил, можно ли мне встретиться со священником. «Нет, говорите прямо мне», — категорично заявил он.

Желание общаться со священниками у меня пропало, улетучилось. С сожалением я понял, что это бессмысленно!

Владимир Иванович МАЗАНИК, коренной минчанин.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НАЎВЕСЯ

Дагэтуль жывы сюжэт Крапівы




У нашай краіне на дзесяць працаўнікоў — адзін кіраўнік. [illegible]

[illegible]

Калі конік да відна
Вёз іх па дарозе,
Памагала, бач, яна,
Седзячы на возе.
І мараль была як след:
Разважаў цвяроза
І, нарэшце, скінуў дзед
Тую бабу з воза.
Удалося Крапіве
Падказаць нам выйсце.

"Глобус Беларусі"

Пад такой назвай выйшла ў свет чарговая кніга Алеся Няўвеся. Многія фельетоны, змешчаныя ў ёй, летась былі надрукаваны на старонках "Народнай Волі".



У сваім "Слове да чытача" аўтар піша:

[illegible]

І сапраўды, кнігі Алеся Няўвеся, можна сказаць, пад забаронай. Беларускія кнігарні адмаўляюцца браць іх для продажу, таму наклад зборнікаў невялікі. Аднак прыхільнікі творчасці Алеся Няўвеся могуць пазнаёміцца з кнігай "Глобус Беларусі", гэтак жа, як і з папярэднімі зборнікамі ("Дзежка дзёгцю", "Адлуп", "Ад аргазму да маразму", "Пустадомкі"), а таксама з новымі фельетонамі на сайце: alesnauwes.com.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Няма ў нас Сахарава і Жэбрака...

Словы Наталлі Шульгі, старшага навуковага супрацоўніка, кандыдата хімічных навук, аб рупавых беларускай акадэмічнай навукі ("Народная Воля", №№195—196 ад 20 снежня 2011 г.), безумоўна, цікавыя і важкія. [illegible] ("Народная Воля", №№189-190, снежань 2011 г.). Але і Наталля Шульга не ідзе да канца ў сваіх развагах аб айчыннай Акадэміі навук. Больш таго, яна наіўна спрабуе справакаваць Лукашэнку, каб той звярнуў увагу на яе і яе пазіцыю па праблемах-памылках (а іх яна называе тры) у беларускай навуцы і, [illegible]

Дарэчы, [illegible] нагадаць [illegible] (у свой [illegible]) інстытутаў [illegible] аб выгнанні [illegible] супрацоўні[illegible]

[illegible]

Яўген ГУЧОК, паэт, публіцыст.

С НАТУРЫ

Богатеем...

Вот все кричат «беднеем-беднеем». А я богатею. На днях был в универсаме, взял товара почти на 100.000 рублей. Кассир спросил у меня удостоверение. Предъявляю — вторая группа инвалидности. Он мне: «Вам льгота 3 процента». Смотрю — и правда: в чеке заминусовано почти три тысячи.

А если я сделаю 10 ходок? Смогу сэкономить 30.000 рублей! Ур-ра! Две бутылки вина, считай, в месяц свалились с неба, так что два банных дня можно отметить как следует. Богатею!

Но постойте, в месяце ведь четыре банных дня, и за 10 ходок в магазин еще на две пляшки не хватит. А говорят, русский царь Петр I поучал: «В банный день лапти продай, но выпей». Увы, лапти давно износились, а продавать больше нечего…

Владимир ГОЛУБ, инвалид. *Минск.*

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Чаканне



У доме састарэлых, ці, як цяпер іх называюць, бальніцах сястрынскага догляду, сваё жыццё. Так і тут, у Войцішках: пасля вячэры насельнікі збіраюцца ля тэлевізара глядзець свой любімы серыял.

І Ванда Камейшык (па этычных меркаваннях імёны людзей і назвы населеных пунктаў зменены) заўсёды хадзіла, але сёння ёй было не да серыяла. Радасць напаўняла душу, і яна нібыта баялася расплюскаць гэтую радасць, ідучы па доўгім калідоры сярод старых і нямоглых людзей. Калі пайшла суседка па палаце аднарукая і такая ж адзінокая Валянціна Курбанок, Ванда выключыла святло і села на табурэтку ля акна, стала пазіраць, як у святле вулічнага ліхтара вецер кружыць лёгкія сняжынкі і кідае іх у нязмёрзлую гразь.

— Так і мяне жыццё пакруціла-пакруціла ды і кінула, — ледзь чутна прамовіла сама сабе Ванда. — Але нічога, ужо, дзякуй Богу, няшмат засталося. Цяпер я буду жыць чаканнем збавіцелькі-смерці.

Са сваіх 90 гадоў апошнія 20 яна правяла, як кажуць, у казённым доме. Спачатку была ў Варавічах, а цяпер ужо пяты год у Войцішках. Казённыя сцены, чужыя людзі, а што зробіш: лёс такі.

На свае гады кабета пачувалася яшчэ і нядрэнна, але жыць не хацела, бо ўжо даўно нічога не трымала яе на гэтым свеце. Баялася, што, як памрэ, то закапаюць у далёкім ад яе роднай вёскі Рабкі мястэчку і ніхто не заплача, не пашкадуе, бо чаго тут чужым людзям шкадаваць: бальніца пазбавіцца яшчэ аднаго нахлебніка, і так кожную капейку лічаць. А сёння нечакана прыехала былая суседка Таццяна Жыбарт. Добрая і спагадлівая кабета вырашыла адведаць няшчасную. Як жа абрадавалася Ванда гэтай сустрэчы! Ледзь павіталіся, як яна стала прасіць суседку:

— Танечка, галубка, збавіцелька! Маю да цябе важную справу: папрасі дзяжурную медсястру, каб, як памру, пазваніла табе. Забяры мяне тады адсюль, Танечка, і пахавай побач з дачушкай Верачкай, адзінай маёй роднай крывіначкай, што і была на гэтым свеце ды так рана памерла ад праклятай гарэлкі. Ну, ты ж сама ведаеш, што табе расказваць. Ты не думай, купляць нічога не прыйдзецца, бо ў мяне ўсё гатова. Я ўжо даўно падрыхтавала, як яшчэ была ў Варавічах. Звязала ў старую прасціну і паклала ў шафу, але нехта скраў. А летась, як ішла машына ў райцэнтр, я папрасіла, каб звазілі мяне ў той магазін, дзе прадаецца ўсё для пахавання, і купіла зноў.

Ванда падышла да шафы і выцягнула адтуль вузел са сваім "багаццем", развязала:

— Вось гэта труну заслаць, — выклала яна на ложак перад суседкай цюлевае пакрывала, — а гэта навалачка на падушку, а гэта каб падушку накрыць, — дастала з-пад нізу белую цюлевую сурвэтку з намаляваным чорным анёлам і крыжыкамі. — І абутак вось маю, і хустку, і касцюм які прыгожы, просценькі, канешне, але такога бэзавага колеру, як я люблю. Калі ты думаеш пра грошы, то не трэба. Можа, дзяржава крыху дасць, а калі не, то і так абыдзешся. — Яна засунула руку за пазуху і выцягнула адтуль вузельчык: у старэнькую насовачку былі ўкручаны грашовыя купюры. — Вось берагу як зрэнку вока. Пакрысе адкладвала, бо тут жа пенсію амаль што ўсю забіраюць, то я пакрысе.

Скручанымі цяжкай працай і старасцю пальцамі яна пачала лічыць тыя няшчасныя грошы і налічыла паўтара мільёна трыста рублёў.

— Хопіць? — з надзеяй зірнула ў вочы суседцы.

— Хопіць, — адказала тая, хоць ведала, што, каб прывезці з далёкага мястэчка ў вёску нябожчыцу, будзе мала нават за машыну заплаціць. Старая Ванда, жывучы тут, напэўна, і не ведала, што грошы абясцэніліся ўшчэнт.

"Ды ёй і ведаць не трэба, — падумала. — Што сваімі дакладу, а што суседзі скінуцца, але пахаваць няшчасную трэба на сваіх могілках".

— Я б табе не дакучала, Танечка, але ж сама ведаеш, там пахавана дачушка. Я ж там і агароджу паставіла, і помнічак адзін на дваіх. Час свайго нараджэння напісала, а калі час смерці і не будзе напісаны, то няма бяды. Галоўнае, каб ляжаць побач...

Таццяна добра ведала, як ставілася тая агароджа і помнічак. Састарэлая Ванда напазычала грошай па ўсёй ваколіцы, а потым кожны месяц са сваёй жабрацкай пенсіі насіла і пакрысе аддавала. Людзі спагадалі няшчаснай, бо ведалі, колькі яна пакутавала разам са сваёй дачкой, якую неміласэрна грыз алкагалізм, пакуль не загрыз да смерці. Некаторыя, хто яшчэ меў сілу працаваць, адмаўляліся ад тых грошай, казалі: не трэба, няхай табе, баба Ванда, будзе на пражытак, — але яна сумленна аддала ўсё да капеечкі...

— Паабяцай, Танечка, што выканаеш маю просьбу, то я ўжо спакойна буду чакаць смерці.

— Чаргі на той свет ніхто не ведае, але калі ты, баба Ванда, памрэш раней за мяне, то абавязкова зраблю так, як просіш. Я і дзецям сваім перадам тваю просьбу. Не перажывай, пахаваем цябе ў роднай вёсцы і святара паклічам, словам, зробім усё, як трэба...

Яны яшчэ з гадзіну пагаманілі. Ванда ўсё распытвала пра вяскоўцаў, пра іхняе жыццё. Потым разам схадзілі да дзяжурнай медсястры, і яна запісала нумар Танінага тэлефона ды адрас. Развіталіся ў вестыбюлі, і суседка, таксама кабета ўжо немаладых гадоў, пакрочыла на аўтобус.

...Калі скончыўся серыял і ў палату вярнулася Валянціна Курбанок, Ванда па-ранейшаму сядзела ля акна. Паклала рукі на падаконнік, на іх паклала галаву, нібыта да чаго прыслухоўвалася. Суседка аклікнула яе раз, другі, потым дакранулася да пляча і, зразумеўшы, што няшчасная дачакалася-такі смерці-збавіцелькі, пайшла сказаць пра гэта дзяжурнай медсястры...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ. *Дзятлаўскі раён.*

УСЛЫШАТ ЛИ?

Это не по-человечески!

Я шла в магазин «Алми» в Пинске по ул.Солнечной и увидела, как велся отлов собак, но не сразу поняла, в чем дело. Стояла грузовая машина, возле нее ходили двое мужчин. Они хватали собак, тащили в машину и делали какие-то уколы, от которых животные скулили и отчаянно ползали в судорогах и муках… Заметила, что там были не все бездомные собаки, попадались под руку ловцам и домашние, с ошейниками.

Почему это происходит на глазах у детей и прохожих, доводя их до истерики, и в такой жесткой форме? Собаки — это же живые существа, наши младшие братья. И не по своей вине оказались они на улице — бездушные хозяева тому причиной. За что же такая изуверская расправа?

10 января возле магазина «Алми» случай повторился. Машина №78-84 (буквы не запомнила) — служба отлова собак — орудовала с 11.00 до 12.00 дня. Хватали «дружков» и убегали, как преступники, успевая при этом оскорблять людей, которые возмущались. Когда в прямом эфире директору ЖКХ г.Пинска А.А.Юшу задали вопрос «Почему в городе нет питомника для бездомных животных?», тот очень «логично» ответил: «У нас плохие дороги».

Одно стало понятно: оказывается, собранные с населения налоги за содержание животных уходят… на ремонт дорог. Не спорю, дороги и впрямь плохие. Но когда наконец-то с животными будут обращаться согласно закону, который прописывает гуманный отлов, передержку их в нормальных условиях, а не в вонючих клетках без воды и еды? Почему не ведется поиск их хозяев — прежних или новых, стерилизация и, в крайнем случае, усыпление ветврачом, а не живодерами? А то, что нет в бюджете денег, это не аргумент. Деньги от налога за животных должны направляться на животных, и тогда у нас не будет бездомных четвероногих друзей.

Свое мнение по этому поводу я изложила в письмах на имя председателя Пинского горисполкома **А.А.Гордича,** директора ЖКХ **А.А.Юша** и председателя облисполкома **К.А.Сумара.** Но услышат ли меня?

Александра БРУНДУКОВА и согласные со мною Т.ГОМОН, И.КРАВЦОВА и Д.СТАНКЕВИЧ, жители Пинска.

Народная Воля http://www.nv-online.info 7 ЛЮТАГА 2012 г.

ЭЎРЫКА!

Камп'ютар будзе кіраваць аўто

Па яго словах, за тры мінулыя месяцы на вуліцах і ў парках, у склепах і пад'ездах падабралі 76 пацярпелых з дыягназам "пераахаладжэнне". 3 дыягназам "адмаражэнне" паступілі 53 чалавекі. Каля 30% пацярпелых былі нападпітку.

ТРАГЕДИЯ

Лицеист повесился из-за несчастной любви

Учащийся Климовичского государственного профессионального лицея №14 покончил жизнь самоубийством из-за несчастной любви.

Парень весь день, 4 февраля, провел с отцом, помогая ему ремонтировать машину. Вечером, когда молодой человек сидел дома за компьютером, кто-то позвонил и сказал, что девушка ему изменяет, на это он ответил, что они уже расстались. 5 февраля около 6 часов сын ушел от отца к бабушке с дедушкой. В этот день они планировали снова заняться ремонтом машины. Когда отец позвонил около 9 часов и попросил пригласить сына к телефону, его стали искать, и дедушка обнаружил внука повешенным на дереве в собственном саду.

Как сообщили belta.by в комиссии по делам несовершеннолетних облисполкома, с начала 2012 года в Могилевской области целенаправленно себя лишили жизни двое несовершеннолетних, а также зафиксировано 4 попытки самоубийства. *«Ситуация нездоровая, если учесть, что за весь прошлый год на Могилевщине покончили жизнь самоубийством трое несовершеннолетних, а в новом году не прошло и двух месяцев, уже имеем две гибели»*, — сказали специалисты.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

«Правілы: не здымай штаны ў акварыуме!»

У Мінск прыязджае вядомая амерыканская дзіцячая пісьменніца Сінція Лорд, аўтар дзіцячага бестселера «Правілы». 9 лютага яна прэзентуе свае кнігі на 19-й Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы.


«Правілы: не здымай штаны ў акварыуме!» — дэбютны раман аўтара. Часткова кніга грунтуецца на рэальных падзеях: у Сінціі трое дзяцей, і ў аднаго з іх аўтызм. Гэта твор аб прыняцці сябе і навакольных, пра радасць дружбы і кахання.

Правілы простыя: *«Калі не хочаш адказваць, задай пытанне. Не выкарыстоўвай два словы, калі досыць аднаго. Часам людзі смяюцца. А часам — кляць. Маму абдымаць можна і трэба, а касіра ў відэапракаце — ні ў якім выпадку».*

ЧУЛІ?

Выйшаў дзявяты том са збору твораў Васіля Быкава

Саюз беларускіх пісьменнікаў працягвае складанне і выданне першага ў гісторыі Поўнага збору твораў народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава.



Алесь Пашкевіч, складанне і каментарыі — Сяргея Шапрана.

Днямі выйшаў з друку 9-ы том, які змяшчае кінасцэнарыі "Трэцяя ракета", "Альпийская баллада", "Западня", "Двое в ночи", "Волчья стая", "На Чорных лядах" і іншыя.

Як паведамляе прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў, творы падаюцца паводле храналагічнага прынцыпу на мове арыгіналаў: беларускай ці рускай. У "Каментарах" да твораў падаюцца значныя варыянтныя тэксталагічныя разыходжанні.

Рэдактар чарговага збору твораў Васіля Быкава — Алесь Пашкевіч, складанне і каментарыі — Сяргея Шапрана.

Аліна ВЕТРАВА.

ДАРЭЧЫ

Амерыканскую літаратуру прадставіць у выставе не толькі Сінція Лорд. У Пасольстве ЗША ў Рэспубліцы Беларусь адзначаюць, што на іх стэндзе будуць прадстаўлены лепшыя сучасныя амерыканскія кнігі. Наведвальнікі будуць мець магчымасць даведацца аб праграмах амбасады ЗША, а таксама спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі ў амерыканскіх універсітэтах.


Жадаючыя праверыць свае веды па гісторыі 20-летніх адносін ЗША і Беларусі змогуць прыняць удзел у камп'ютарнай віктарыне.

Аліна ВЕТРАВА.

СВЕЦКАЯ ХРОНІКА

Сяргей Звераў жэніцца з беларускай спявачкай

Дагэтуль хадзілі чуткі, што вядомага цырульніка не цікавіць жаночы пол.



Але цяпер расійскі «кароль гламуру» заявіў, што хутка мае намер ажаніцца. Абранніцай Зверава стала маладая беларуская спявачка Алена Галіцына, якая робіць кар'еру на расійскай эстрадзе.

Хто такая Алена Галіцына? Вось што напісана на яе сайце: *"Нарадзілася ў беларускім Палессі. Калі Алене споўнілася 16 гадоў, прыгожую харызматычную дзяўчыну запрасілі на працу ў мадэльнае агенцтва. Лена ўдзельнічала ў модных паказах і фотаздымках, якія праводзяцца па ўсім свеце. У гэты ж час Лена спрабуе сябе ў якасці вядучай, атрымлівае тытул «Лепшая вядучая года» Віцебскай вобласці. У складзе групы карэспандэнтаў тэлеканала «РТР» Лена пераязджае ў Мінск, а адтуль пазней у Маскву.*

У апошнія гады Лена жыве ў Лондане, здымаецца ў кіно».

ЛЁСЫ

ІХ СЯМ'Я

Мінчане Таццяна і Сяргей усынавілі ўжо семярых дзяцей, і, магчыма, гэта не мяжа. Карэспандэнт "Народнай Волі" наведаўся да іх у госці…



Шэсць гадоў таму наша газета расказвала пра тое, як складвалася жыццё Таццяны і Сяргея. Не буду вяртацца зноў да той гісторыі, адзначу толькі, што, пераасэнсаваўшы памылкі маладосці, абое ў рэшце рэшт прыйшлі да Бога. І самі пазнаёміліся ў касцёле. Далі зарок перад Богам, што больш ніколі не будуць ужываць алкаголь. Праўда, высветлілася, што Тацяна па стане здароўя не можа мець сваіх дзяцей, але ж новае жыццё толькі пачыналася... І сёння яны ўжо гадуюць семярых дзетак, якіх усынавілі з дзіцячых дамоў.

…У пярэднім пакоі мяне сустракаюць гаспадары кватэры, малеча з цікаўнымі вачыма, кот і сабака ростам з невялікае цяля. Ветлівыя дзеткі працягваюць рукі, каб "паздароўкацца", радасны сабака стараецца заскочыць на плечы…

— Пазнаёміліся мы з Сяргеем у 1999 годзе, праз тры гады ажаніліся, — Тацяна на кухні гатуе каву і распавядае: — Вырашылі, што без дзяцей — ніяк. Даведаліся, што трэба для ўсынаўлення, і такім чынам у 2006 годзе Андрэйка стаў, як кажуць, нашым першынцам. Гэта было, здаецца, як учора. Я тады, як толькі яго ўбачыла, адразу ж заплакала. Двухгадовы Андрэй таксама заплакаў.

— Андрэйка спалохаўся, — далучаецца да размовы Сяргей. — Бо ў дзіцячых дамах маленькія дзеці прызвычайваюцца да таго, што калі да іх нехта і прыходзіць, дык абавязкова каб забраць у бальніцу на ўколы ці яшчэ куды-небудзь. Самае страшнае, што там дзеці наогул амаль не плачуць. Пішчаць, вішчаць — гэта так. Але не плачуць, бо ўсё роўна ніхто не падыдзе і не супакоіць. Тата і маці не прыйдуць.

Свайго першага сына бацькі выбіралі з фотаальбома Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення. Узялі добраслаўленне ў епіскапа. Сяргей паглядзеў на фотаздымак і ўсклікнуў: "Дык гэта ж копія майго брата ў дзяцінстве!" Працэдура ўсынаўлення шмат часу не заняла, неабходныя дакументы сабралі прыкладна за паўтара месяца. Думалі, што будуць праблемы з жыллёвай плошчай (на той час яны мелі невялікі пакой у кватэры), але гэта аказалася неістотным. Галоўнае — каб бацькі былі ў стане матэрыяльна забяспечыць выхаванне дзіцяці. Бо калі заробак добры, дык кватэру можна і здымаць.

— Трэба было не менш за дзесяць разоў сустрэцца з Андрэем, каб ён прызвычаіўся да нас, — успамінае маці. — Каб дзіця прыняло новых бацькоў. Перад тым, як мы яго забіралі, Андрэйка патрапіў у бальніцу з атытам. Пачалі наведваць, ён ацаніў клопат — пайшоў на кантакт. Бо ў дзіцячых дамах малыя вельмі замкнёныя. Яны ж перажылі трагедыю. Андрэйку, напрыклад, у дзіцячы дом забралі з прытона з запаленнем лёгкіх. Калі мы ў першы раз прывезлі яго дадому, у яго, напэўна, ад перажыванняў аж праблемы са страўнікам пачаліся. Чалавечак усё разумеў, але быў запалоханы. Нават ад кошкі два тыдні ўцякаў. Ён уваходзіў у новы свет. Спаў пастаянна ў мяне на жываце. З часам "адтаяў", яму ўсё было цікава. Адаптацыя праходзіла недзе год. Змянялася псіхалогія, што была ў дзіцячым доме, разам з сынам мяняліся і мы. Дзеці павінны адкрыцца, зразумець, што іх не падмануць. Што гэта іх родны дом, дзе не трэба ні абараняцца, ні выжываць.

— З Андрэйкам мы хацелі забраць і Паўліка, але нам сказалі, што лепш не спяшацца, — дадае Сяргей. — Маўляў, не так проста будзе і з адным, прыглядзіцеся… Прыглядзеліся. І недзе праз год наша сям'я папоўнілася трохгадовым Паўлушкам і двухгадовай Алінкай. Яшчэ праз год узялі Святлану і Міколку. Дарэчы, Светачка пайшла толькі да Тацяны, хоць яе хацелі забраць каля дзесяці пар. Проста не адыходзіла! Павісне на шыі — і ўсё. Мне і зараз дзеці па спіне ходзяць, масаж робяць, а Святлана — да мамы. Яна, да слова, вельмі падобна на маці Тацяны.

— Але ж і пасля гэтага нам, як кажуць, не жылося спакойна, — усміхаецца гаспадыня. — І паўтара года таму ўсынавілі яшчэ двух дзяцей. Такім чынам, зараз у нас сямёра. Самай маленькай — Аленцы — тры гады. А Андрэю, Паўліку і Міколку споўніцца па 8 гадоў у адзін дзень — 14 лютага, на Дзень Святога Валянціна! Так ужо атрымалася...

Калі ў Тацяны і Сяргея было пяцёра дзяцей, ім далі чатырохпакаёвую кватэру. Праўда, не проста так, а давялося даплачваць. Штомесяц неабходна разлічвацца за крэдыт. Але яны стаяць у чарзе яшчэ на адну кватэру. Сям'я ж павялічылася...

— Фінансаў, безумоўна, не хапае, таму я, напрыклад, працую на трох работах, — тлумачыць бацька. — Арганізоўваю дзіцячыя фестывалі, наладжваю музычныя інструменты, маю занятак у дабрачынным цэнтры "Карытас". Тры разы ў месяц закупляем прадукты на аптовым рынку — крупы, алей, нешта яшчэ. Толькі на гэта каля паўтара мільёна аддаём. Парсюка звычайна купляем поўнасцю ў вёсцы. Так танней і практычней, бо не трэба кожны дзень бегаць па крамах. На адзенне страты, дзеці ж растуць. Праўда, дапамагае дабрачынны цэнтр, але практычна ўсе грошы, што зарабляем, у месяц і разыходзяцца.

Тым часам Тацяна, якая, дарэчы, зараз вучыцца на сямейнага кансультанта, распавядае мне пра таленты дзяцей:

— Усе выступаюць на фестывалях — граюць, спяваюць. Андрэй — мастак, паэт, спявае і танцуе, займаецца керамікай. Паўлік — супергаспадар. Сумкі з магазіна прынесці — гэта яго любімы занятак. Міколка таксама спявае і малюе добра. Алінка вельмі любіць рамансы. Нават калі кніжку гартае, то нешта спявае. Святлана па гаспадарцы любіць мне дапамагаць. Віталік — сур'ёзны танцор. Вось танцуе — і ніколі не ўсміхаецца. Аленку вы самі чуеце…

З пакойчыка даносіўся дзіцячы спеў: "Алілуя, алілуя!"

— Мы рэгулярна стараемся хадзіць усе разам у касцёл, старэйшыя дзеці наведваюць нядзельную школу, — кажа гаспадар. — У выхаванні Бога і Любоў ставім на першае месца. Трэба, каб дзеці жылі па-чалавечы, каб з іх Людзі выраслі.

— Сямёра дзяцей — гэта мяжа?

— Спачатку гэтых трэба крыху на ногі падняць, а затым… Чаму б і не? Вы ж паглядзіце, колькі ў дзіцячых дамах дзетак! Паглядзіце ў іх разумныя вачаняткі, у якіх надзея. Надзея, што і да іх калі-небудзь прыйдуць тата і мама…

Алесь СІВЫ.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Суд за инакомыслие,

или Почему для судьи Минского городского суда Владимира Хробастова свидетельские показания четырех человек оказались ничего не значащими словами?



Что «невыездному» судье Владимиру Хробастову до нарушения прав Николая Козлова?

3 февраля в Минском городском суде рассматривалась кассационная жалоба подполковника милиции в запасе Николая Козлова. Он требовал отменить решение Московского суда Минска о привлечении его к административной ответственности, поскольку не совершал мелкого хулиганства, за которое 20 декабря 2011 года его наказали пятью сутками ареста. Заседания вел судья Минского городского суда **Владимир Хробастов**. Человек немолодой, видимо, опытный.

Однако ему хватило полчаса, чтобы «разобраться» в деле и не найти оснований, чтобы удовлетворить жалобу Козлова.

Это решение сенсационным не назовешь. Николай Козлов не очень-то верил в справедливое рассмотрение его жалобы. Понимал, что не для того его схватили на улице, вырвали из толпы и впихнули в автобус люди в штатском, чтобы потом суд признал их действия незаконными (такой сценарий в современной Беларуси отрепетирован до автоматизма и редко дает сбои). Но ребята в погонах так напортачили в рапорте, что, казалось, выдавать черное за белое на этот раз не получится.

Как уже писала «Народная Воля», 19 декабря 2011 года Николая Козлова задержали на пешеходном переходе у Октябрьской площади, а в рапорте указали, что Козлов был задержан совершенно в другом месте — у Красного костела. Якобы за то, что ругался матом и нарушал покой граждан. Но после задержания Козлова посадили в микроавтобус, потом отвезли к Дому офицеров и пересадили в другой автобус, в котором какое-то время продержали еще с четырьмя задержанными, а затем отвезли сначала в Октябрьский РОВД, а затем в Московский. То есть были свидетели, которые могли подтвердить, что Николай Козлов не был у Красного костела и не ругался там матом в то время, которое указано в милицейском рапорте.

Однако судья **Елена Черняк**, которая рассматривала административное дело в суде первой инстанции, приняла к сведению показания милиционеров, а ходатайство Козлова установить и допросить свидетелей, которые были с ним в милицейском автобусе, отклонила. А также не посчитала весомым доказательством представленные в суде оператором сотовой связи распечатки телефонных разговоров Николая Козлова, по которым легко устанавливалось, что в то время, когда сотрудники милиции приписали ему нарушение общественного порядка у Красного костела, он находился в районе Дома офицеров, т.е. Октябрьской площади!

В Минский городской суд Николай Козлов пришел с адвокатом и свидетелями. **Дмитрий Сильченко и Александр Степаненко** были готовы подробно рассказать в суде, как «катались» в милицейском автобусе вместе с Николаем Козловым вечером 19 декабря. Двое других свидетелей, которые не смогли прийти в суд, дали письменные пояснения адвокату Козлова, которые он, к слову, позже в суде и зачитал.

Но как проходило это заседание?

В большом зале. Кабинет судьи Хробастова вместить всех, кто пришел на это слушание, не мог. Громкое дело Козлова вызвало интерес у журналистов, правозащитников, общественных активистов. Перед началом заседания журналисты высказывали предположения, чем все может закончиться. Виктор Федорович из «Белорусских новостей», который пишет о самых «громких делах» современной Беларуси, предположил, что жалобу Козлова удовлетворят, а дело отправят на новое рассмотрение, но потом затормозят и спишут за сроком давности. О похожем случае журналист писал после президентских выборов 2010 года. Тогда, вечером 19 декабря, когда милиция избивала и хватала всех, кто был не согласен с результатами выборов и пришел на площадь Независимости, на Немиге задержали семейную пару — ученых-биологов, которые ехали на вокзал встречать дочь-школьницу. Им приписали участие в несанкционированном митинге у Дома правительства и осудили. Главу семьи на 15 суток, его жену наказали штрафом. Выйдя из суда, женщина тут же бросилась опротестовывать это решение, потому что в тот вечер они с мужем и близко не были около Дома правительства. Женщина собрала неопровержимые факты — запись с камер видеонаблюдения метро, которые четко фиксировали: в то время, когда, согласно милицейским показаниям, семья ученых якобы протестовала на площади Независимости, они мирно спускались в минскую подземку, чтобы ехать на вокзал встречать дочь. Минский городской суд решение суда первой инстанции отменил и направил дело на новое рассмотрение. Но доработка затянулась так надолго, что истек двухмесячный срок давности по административным правонарушениям. Т.е. нового разбирательства не было, перед учеными никто не извинился, и за ложные показания ни один милиционер ответственности не понес.

Виктор Федорович предположил, что дело Козлова будет развиваться по такому же сценарию. Но он ошибся. В данном случае наше правосудие отказалось даже изображать хорошую мину. Возможно, потому, что Николай Козлов, в отличие от ученых-биологов, не аполитичный человек. В 2010 году он со страниц «Народной Воли» на всю страну рассказал о том, как в Беларуси фальсифицируются выборы, причем привел факт, свидетелем которого был сам. В прошлом году заявил на всю страну, что «определенная часть милиции превратилась в организованную преступную группу, безнаказанность которой обеспечивают прокуратура и суды».

К слову, одним из первых вопросов судьи Хробастова к Николаю Козлову был следующий: «Как вы думаете, почему вас задержали?»

— Может быть, потому, — ответил Козлов, — *что я давал оценку действиям сотрудников милиции, которые работают на акциях протеста, молчаливых акциях. Может быть, потому, что я долгое время работал в Центральном РОВД, я бывший сотрудник милиции. А вообще, надо спросить у них. Это вопрос отдельного разбирательства. Соответствующую жалобу с просьбой разобраться в этой ситуации я подал в прокуратуру. Потому что те сотрудники милиции, которые, не видя меня, не задерживая меня, потом составили этот рапорт, совершили должностное преступление.*

Николай Козлов предложил судье послушать свидетельские показания Андрея Милоша, который видел, как его задерживали в районе Октябрьской площади.

Судья Хробастов отклонил эту просьбу, заявив, что процессуальный кодекс не предусматривает допрос свидетелей в суде кассационной инстанции. Правда, внимательно прослушал речь адвоката, который зачитал четыре свидетельских показания и предоставил суду другие доводы, свидетельствующие, что сотрудники милиции оболгали Николая Козлова и рапорт в отношении него сфальсифицировали. Адвокат ходатайствовал отменить постановление Московского районного суда и отправить дело на новое рассмотрение. Приобщив речь адвоката и четыре протокола опроса свидетелей к материалам дела, судья Хробастов удалился для принятия решения. Выйдя через 5 минут, быстренько и невнятно его зачитал:

«Постановление суда Московского района Минска от 20 декабря 2011 года в отношении Козлова Николая Георгиевича оставить без изменения, а жалобу без удовлетворения. У вас есть 6 месяцев на обжалование данного постановления председателю Минского городского суда».

— Вам показались незначительными все эти факты? — спросил Николай Козлов у судьи.

— Все прочитаете в постановлении. Хорошо? Сейчас я комментировать ничего не буду, — ответил судья Хробастов.

— Вы ответьте: да или нет, — настаивал Козлов. — **Мне просто любопытно. Человек же должен чем-то руководствоваться.**

— Комментировать сейчас ничего не буду, — повторил судья Хробастов и удалился из зала суда.

В отличие от него, Николай Козлов прокомментировал решение суда:

— Я считаю, что судья Хробастов — бессовестный судья. Я не сомневаюсь, что если в деле есть хоть малейшая политическая составляющая, правосудия нет. Но, видимо, у судьи Хробастова — опыт в таких делах, он включен в список невъездных в страны ЕС белорусских чиновников.

Говорят, что суд у нас независимый. Но независимый от чего? От совести? От чести?

Николай Козлов намерен обжаловать это решение Минского городского суда. *«Если потребуется — буду обжаловать до самой последней инстанции»*, — заявил он.

Мария ЭЙСМОНТ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
7 ЛЮТАГА 2012 г.

ПЕРСОНА

Екатерина НОВИКОВА: «Как жить в семье, где всегда кто-то дурак?»



Неинтересных людей и вправду не существует. Но встречаются особенные личности, о которых без прикрас можно сказать: они делают мир лучше.

*Художник **Екатерина Федоровна НОВИКОВА** — как раз из таких. В следующем году она отпразднует большой праздник — 90-летний юбилей. Сегодня она рассказала «Народной Воле» о том, как делает чудные вещи из природных материалов, с чего начинается счастье и как больше полувека прожить в согласии с любимым человеком.*

Счастье быть собой

— Кто вы по профессии?

— К сожалению или к счастью, никто, — *эти слова Екатерина Федоровна произносила, идя со мной по своей персональной выставке работ из природных материалов «В соавторстве с природой».* — До войны я закончила в Ленинграде девять классов. Каждый год мама отправляла меня и младшего брата в деревню к бабке с дедом. Там нас и застала война. Родители остались в Ленинграде, а мы — в оккупации. В первый же год бабушка и дедушка умерли. Мне было 18 лет, брату 13. Я научилась косить, зимой от нечего делать — прясть и ткать.

Война закончилась, когда мне было 22 года — самое время выходить замуж. А потом дети пошли. Когда у меня было уже трое детей, я закончила десятый класс. Деток оставляла с соседкой, а сама училась. Хотела поступить в университет, да вот на заочное брали только работающих. Куда ни понесу документы, везде просят справку с места работы. В инязе не заметили, что справки нет. Так хорошо сдала экзамены, что сама не ожидала. Меня и директор института поздравил, да вот только справочку попросил принести… Так и осталась неученой. Потом, правда, нагнала, даже учебники писала. Много раз мне советовали написать диссертацию, мол, такого уникального материала нет больше ни у кого. Да какая уж тут диссертация, мне бы диплом…

Иногда думаю: хорошо, что не получила никакой профессии. Всю жизнь я занималась тем, что мне нравится. Все что сделаю — дарю. Все картины, которые участвовали в выставке, обещаны детям. Так и говорю: выбирайте, но подарю потом, на День рождения.

— Продавать свои работы никогда не хотели?

— Вся беда в деньгах. Я давно убедилась в том, что человеку очень мало нужно для счастья. Мой сын работает в Академии наук и так же, как я, равнодушен к материальному. Он умница, думаю, что мог бы Нобелевскую премию получить, но не карьерист по натуре. Жажда прославиться у него совершенно атрофирована... Он даже не хочет писать диссертацию. Все его научные труды систематизировала дочь, но он так и не собрался защитить научный труд. Ему это не нужно. Хотя чего удивляться — я и сама такая…





Спасибо Богу и характеру

— Знаю, что у женщин не принято спрашивать о возрасте, но все же… Поделитесь секретом долголетия?

— Благодарю Бога и характер. Я не завидую, не жадничаю, радуюсь любой работе. Даже на даче что-то вскопаю, а после похвалю себя: молодец, в таком возрасте — и трудишься. А потом все время выписывала журнал «Здоровье», ходила в бассейн и когда-то давно была моржихой. Люблю ставить эксперименты — смогу или нет? Даже както голодала — целых семь дней! Наверное, сыграло свою роль и то, что у моего мужа была язва. Вместе с ним я соблюдала строгую диету. Умер он в 93 года — был старше меня на девять лет…

Мы никогда не ссорились, хоть и характеры у нас совершенно разные. Он был такой серьезный, солидный, а я с виду совершенно легкомысленная, хоть в деле могу быть очень серьезной. Конечно, иногда он настаивал на своем, я на своем, но компромиссы находили всегда. Прожили 62 года без битья тарелок…

— По принципу «противоположности притягиваются»?

— Не всегда. Нужно уступать друг другу. Один раз я такую бурную сцену раздула! В молодости дело было… Он назвал меня дурой, а я разрыдалась. Ну как после такого жить дальше?! Ведь дети слышат! Как же нам их воспитывать, если они слышат, что мама — дура, а папа — дурак… С тех пор никогда не позволяли себе оскорблений. Могли в чем-то поспорить, но грань приличия не переступали.

Это, кстати, и молодым совет. Нужно, чтобы было взаимопонимание. Как жить в семье, где кто-то всегда дурак? Я знаю такие семьи, когда муж всегда оглядывается на жену. Это ведь тоже ужасно… Я даже с внучкой своей поссорилась. Характер у нее, на мой взгляд, жестковатый: «Я кормлю семью, а он ничего не может…» Невозможно жить постоянно с оглядкой, когда кто-то за тобою следит и выискивает недостатки. Ничего хорошего из такой семьи не выйдет.

— А вы часто собираетесь всей семьей? Сейчас время такое — его всегда не хватает, и многие часто жертвуют именно семейными посиделками…

— Мы всегда собираемся на мой День рождения, Восьмое марта. Но тогда много шума, все смеются, и не поговоришь нормально. Я люблю, когда они ко мне по одному приходят. Мне же хочется спросить, как на работе, как здоровье, поговорить… Так что я теперь их по одному принимаю.



Рассветы на всю жизнь

— Почти всю жизнь я работаю с детьми, — *говорит Екатерина Федоровна.* — Вырастила троих своих, но мне так хотелось работать! Да как — муж постоянно в командировках, на кого мне оставить детей? А вот когда они подросли, я как с цепи сорвалась. Начала работать в детском саду, потом в детских оздоровительных лагерях, а потом на Городской станции юннатов в студии «Природа и творчество». Учила детей видеть красоту природы, а сама черпала идеи на выставках. Особенно меня впечатлила лесная скульптура. Сразу подумала: «Ой, да ведь я тоже так могу!»

Когда я работала в лагере, водила детей встречать восход солнца. В четыре часа утра все встали, как ваньки-встаньки, хоть им спать еще и спать. Но это не проходит даром. Встретила как-то уже взрослого дяденьку, который признался, что до сих пор вспоминает те рассветы…

Мария МАЛЕВИЧ.

АПЫТАННЕ

49,9% беларусаў ніколі не купляюць кнігі

Ужо два дзесяцігоддзі Беларусь — незалежная краіна са сваёй культурнай і адукацыйнай палітыкай, творчымі саюзамі, перыядычнымі выданнямі. Як змянілася становішча беларускай літаратуры за часы незалежнасці? Як паведамляе прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў, у 2011 годзе Саюз беларускіх пісьменнікаў звярнуўся да лабараторыі "Новак" з просьбай правесці апытанне, каб даведацца, колькі чытаюць беларусы, што іх цікавіць у літаратуры і хто з сучасных беларускіх літаратараў найбольш падабаецца чытачу.

Вынікі несуцяшальныя:

• ***Беларусы чытаюць мала***. Ніколі не бярэ ў рукі кнігу трэць насельніцтва (33,7%). Палова беларусаў кніг не купляе, у лепшым выпадку пры неабходнасці пазычаюць у знаёмых ці бяруць у бібліятэцы.

• ***Сучасную замежную літаратуру (у першую чаргу расійскую) ведаюць лепей за сваю.*** 62% апытаных наогул не цікавяцца беларускімі кнігамі. Істотная частка (13,3%) зусім не ўмее чытаць па-беларуску.

• На пытанне ***"Якіх сучасных беларускіх пісьменнікаў вы ведаеце?"*** найчасцей называюць імёны, якія сталі знакавымі яшчэ за савецкім часам: Васіля Быкава (6,5%), Уладзіміра Караткевіча (3,8%), Івана Шамякіна (3,2%). Пераважная ж большасць не ведае нікога (74,6%). Для параўнання: у сучаснай масавай расійскай літаратуры беларусы дасведчаны значна лепей: 17,8% ведаюць, хто такая Дар'я Данцова.

• Што да густаў, то ***ў безумоўных лідарах дэтэктывы*** — ім аддаюць перавагу 38,3% аматараў чытання. 28,1% калі і бяруць у рукі кнігу, то гэта жаночы раман. Кнігу класіка з паліцы здымаюць 26,5% ад усіх беларусаў, якія чытаюць хаця б раз на год.

• На думку нашых суайчыннікаў, ***зрабіць беларускую літаратуру больш папулярнай маглі б цікавыя аўтары і творы*** (52,4%), іх большая жанравая разнастайнасць (27,2%), а таксама лепшая рэклама (22,9%).

• Варта таксама адзначыць, што дзейнасць найстарэйшай творчай арганізацыі Беларусі — Саюза беларускіх пісьменнікаў — станоўча ацэньваюць 61,4% апытаных.

БЛІЦ-КАМЕНТАРЫЙ

Барыс ПЯТРОВІЧ: "Пісьменнікам розных саюзаў трэба часцей сустракацца з чытачамі"

*Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў **Барыс Пятровіч** называе вынікі апытання не самымі прыемнымі.*

"Літаратурныя імёны-брэнды савецкіх часоў беларусы дагэтуль памятаюць, а вось новых так і не з'явілася, — *гаворыць ён*. — Гэта значыць, што той курс, які ўзяла Беларусь у культурнай сферы, — малаэфектыўны.

Год кнігі — добрая нагода, каб аб'яднаць высілкі дзяржавы і грамадскіх арганізацый дзеля змены сітуацыі. Самы важны клопат дзяржавы ў галіне культуры — падтрымліваць мову карэннай нацыі краіны. Гэта тычыцца ўдасканалення і пашырэння школьных праграм па мове і літаратуры, павелічэння колькасці адукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання, стварэння, нарэшце, цалкам беларускамоўнага Нацыянальнага ўніверсітэта.

Абсалютная большасць беларусаў дагэтуль спажывае інфармацыю праз тэлебачанне. Але на беларускім ТБ няма беларускай кнігі, няма беларускіх аўтараў, ды і наогул беларускай мовы збольшага няма. Такім чынам, інфармацыя пра новыя кнігі і новых аўтараў не даходзіць да чытачоў.

Палітыка беларускай дзяржавы павінна стаць беларусалюбнай. Ну а пісьменнікам розных саюзаў трэба часцей і без перашкод сустракацца з чытачамі, каб папулярызаваць лепшае са створанага".

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

...***97,1% беларусаў не чытаюць замежную літаратуру ў перакладзе на беларускую мову.*** 68,4% з іх ні пры якіх умовах не абралі б беларускамоўную версію кнігі. Аднак 20,3% згодныя набыць замежны твор па-беларуску пры ўмове добрай якасці перакладу.

...асноўны шлях кнігі да беларускага чытача — ад сяброў і знаёмых. 44% аматараў чытва пазычаюць кнігі, 28,7% — купляюць у кнігарнях, у тым ліку праз інтэрнэт, 26,8% — па-ранейшаму наведваюць бібліятэкі. 12,6% аддаюць даніну сучаснасці і спампоўваюць кнігі з інтэрнэту. ***49,9% беларусаў ніколі не купляюць кнігі.***

...***ніводнай сучаснай беларускай пісьменніцы не змаглі назваць 84,9% апытаных***. Першая ж шасцёрка названых выглядае так: Святлана Алексіевіч (2,8%), Цётка (2,5%), Валярына Кустава (2,1%), Раіса Баравікова (1,5%), па 1,1% набралі Наталля Батракова і Яўгенія Янішчыц.

...сярод айчынных пісьменнікаў, якіх беларусы не проста ведаюць, але і любяць чытаць: Васіль Быкаў (7,4%), Уладзімір Караткевіч (7,4%), Якуб Колас (5,5%), Янка Купала (3,9%) і Іван Мележ (2,9%).

...улюбёныя небеларускія пісьменнікі: Дар'я Данцова (11,3%), Аляксандра Марыніна (5,6%), Таццяна Усцінава (3,4%), Леў Талстой (2,5%) і Юлія Шылава (2,0%).

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Алег ІВАНОЎ: «У Англіі білеты на чэмпіянат свету па веласпорце на трэку каштуюць каля 70 долараў»

*Міжнародны саюз веласіпедыстаў прыняў рашэнне, што чэмпіянат свету па веласпорце на трэку пройдзе ў лютым 2013 года ў Мінску. Аб тым, чаму выбар спыніўся на Мінску, наколькі гэта значная падзея для Беларусі, што будзем з гэтага мець ці згубім нешта, карэспандэнт "Народнай Волі" гутарыць з галоўным трэнерам нацыянальнай зборнай Беларусі па веласпорце **Алегам ІВАНОВЫМ.***

— Я лічу, што для краіны гэта грандыёзная падзея, бо вельмі складана было атрымаць першынство, — распавядае суразмоўца. — Думаю, вялікае значэнне мела тое, што ў Мінску пабудаваны якасны веладром на "Мінск-Арэне".

— А вынікі, якія паказваюць на міжнародных спаборніцтвах беларускія веласіпедысты, улічваліся нейкім чынам?

— Гэта зусім не ўлічваецца пры выбары месца правядзення першынства. Больш за тое, наколькі мне вядома, ніколі і не ўлічвалася! Проста Міжнародны саюз развівае сваю праграму. Вось ніколі не праводзіўся такі форум у Беларусі — атрымайце. Хоць была сур'ёзная барацьба з Мексікай…

— І што дапамагло нам атрымаць перамогу?

— Тое, што знаходзімся ў Еўропе. Лепшыя гоншчыкі свету — еўрапейцы і аўстралійцы, хоць апошнія таксама базіруюцца ў Еўропе і там спаборнічаюць. Мала ў каго ёсць жаданне ляцець у Мексіку, дзе своеасаблівы клімат, цяжкая акліматызацыя… Магчыма, еўрапейскія краіны і падтрымалі кандыдатуру Мінска, каб не выступаць у Мексіцы.

— Вы бачылі многія веладромы свету… Што можна сказаць пра беларускі веладром ў параўнанні з іншымі?



— Ведаеце, веладромы ў асноўным аднатыпныя, бо амаль на ўсіх палатно ўкладвае вядомая нямецкая кампанія "Шурман Архітэкт". Якасць трэка — гэта для спартсменаў галоўнае. Але інфраструктура ў Мінску больш фундаментальная. Нават алімпійскі комплекс у Пекіне, на мой погляд, саступае.

— У матэрыяльным плане ад правядзення чэмпіянату мы што-небудзь будзем мець?

— Наўрад ці. Наадварот — дзяржава павінна будзе патраціцца, каб арганізаваць першынство на ўзроўні. Так, Міжнародны саюз вызначыць нейкую суму, але, натуральна, яе не хопіць. З іншага боку, з усяго пры правільным падыходзе да справы можна атрымаць выгаду. На чэмпіянат прыедуць турысты, каманды, валюта будзе для краіны…

— І што, турысты ездзяць па ўсім свеце на такія спаборніцтвы?

— Безумоўна! Гэта ж элітны чэмпіянат, а не юнацкае першынство. Да яго застаецца год, але, думаю, заказы на браніраванне гасцініц пачнуць паступаць ужо зараз. На апошнім чэмпіянаце свету ў Капенгагене на трыбунах яблыку не было дзе ўпасці. Асабліва калі праходзяць фіналы. Людзі прыходзяць, нягледзячы нават на тое, што білеты дарагія. У Англіі, напрыклад, сярэдні квіток на спаборніцтвы такога кшталту каштаваў 70 долараў.

— Але ж у Беларусі веласпорт — гэта не хакей. Думаеце, беларускія балельшчыкі зацікавяцца мерапрыемствам?


— На жаль, папулярнасць веласпорту ў краіне і на самай справе не надта вялікая. На новы веладром прыходзяць у асноўным тыя, хто сам звязаны з гэтым відам спорту. Няма такога, як было ў старыя часы. Памятаю, у Туле сапраўднае паломніцтва назіралася, калі праходзілі трэкавыя спаборніцтвы. Але ж у арганізатараў яшчэ год ёсць на ўсё пра ўсё. Патрэбна моцная піяр-кампанія, людзей неабходна зацікавіць. Як кажуць, усё ў нашых руках.

Алесь СІВЫ.

Хавай нос у Апанасаўскі мароз

Па гарызанталі: 1.У … кожны молад. 3.Лоўкасць у рабоце. 6. … Каралі. У беларусаў-католікаў назва пярэдадня Вадохрышча (6 студзеня). 9.Прыйшоў Апанас-Ламінос — беражы … і нос (прык.). Прысвятак Апанас на Беларусі адзначалі 31 студзеня. 10.Птушка, імем якой на Каляды называлі варон і каршуноў, каб яны не чынілі шкоды ў гаспадарцы. 12.Калі напярэдадні Калядаў неба зорнае — будуць несціся … (прыкм.). 13.Вадохрышчанскі снег абяцае вялікі … грыбоў (прыкм.). 14.Мучны выраб з цеста; з … у руцэ гаспадар клікаў Мароза на калядную вячэру. 17. … будзе ўраджайны, калі на Вадохрышча ідзе снег (прыкм.). 18. Чырвоны … — у сялянскай хаце самае пачэснае месца; у ім побач з абразамі звычайна захоўвалася асвечаная вада. 20.Адтуліна, што злучае поласць рота з глоткай. 21.Зорная … на Богаяўленне (Вадохрышча) — ураджай на гарох і ягады (прыкм.). 24.Прадмет хатняга абсталявання для сядзення. 25.Тое, што і заручыны. У народзе казалі: "Вадохрышчанскія … — да шчаслівай сям'і". 27.Калі на Калядах … — … і на Пятра (прыкм.). 30.Старая назва сапфіру, рубіну. 31.Дрэвавая і кустовая расліна, на якую, паводле павер'яў, перасяляецца чорт з асвечанай вады да асвячэння … на Вербніцу. 32.На Святы Сцяпан усякі сабе … (прык.). Прысвятак Сцяпан адзначаўся на Беларусі 9 студзеня. 33.На Вадохрышча … цёплы — будзе хлеб цёмны (прык.). 34.Калі на Вадохрышча вельмі сцюдзёна — у … будзе вельмі горача (прыкм.).

Па вертыкалі: 2. … ды лебяда — чортава яда (прык.). Каб пазбавіцца ад …, некаторыя сяляне некалі на Вадохрышчанскую каляду на качарзе аб'язджалі агарод. 4.Участак зямлі, які перад сяўбой апырсквалі святой вадой. 5."Вунь пасялілася сініца,\\ Ужо наведала …" — з верша М.Стральцова "Першы снег". 7.Водная прастора, зручная для стаянкі суднаў. 8.Хвойныя дрэўцы; на Вадохрышча іх ставілі кругом палонкі, каб закрыць святую ваду ад нечысці. 9.Склад, асяроддзе. 11.Папяровы грашовы знак. 15.Тое, што добрыя людзі адзін другому жадаюць і на святы, і ў будні ("Будзь здароў цэлы год, як калядны лёд"). 16. … дарогу перамяце, а корм падмяце (прык.). Свята … беларусы-католікі адзначалі 24 студзеня. 19.Чырвонае … ў печы, патрэскванне дроў — да моцных маразоў (прыкм.). 20.Калі на Вадохрышча … — быць добраму ўраджаю (прыкм.). 22.Калі на Вадохрышча на небе … — то і ў засеках будзе … (прыкм.). 23.Каб у хляве — парсюк гладкі, а на стале каб смачныя … (добрае пажаданне на Вадохрышча, Вялікдзень і інш. святы). 26.У кумы і … смачнейшая (прык.). 28. … Хрысціцель, або Прадвеснік. Паводле Бібліі, прапаведнік, які хрысціў Ісуса Хрыста ў рацэ Іардан. На Беларусі ўсе вадасвятныя месцы здаўна маюць назву "Ярдан". 29.Крэсла, сімвал манархічнай улады.



Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. г.Дзяржынск.

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1.Холад. 3.Спрыт. 6.Тры. 9.Шчокі. 10.Голуб. 12.Куры. 13.Ураджай. 14.Блін. 17.Год. 18.Кут. 20.Зеў. 21.Ноч. 24.Лава. 25.Змовіны. 27.Ясна. 30.Яхант. 31.Вярба. 32.Пан. 33.Дзень. 34.Жніво.

Па вертыкалі: 2.Асот. 4.Поле. 5.Балкон. 7.Рэйд. 8.Ялінкі. 9.Шэраг. 11.Білет. 15.Здароўе. 16.Аксіння. 19.Полымя. 20.Завея. 22.Чыста. 23.Аладкі. 26.Вада. 28.Іаан. 29.Трон.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск,
вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная:
тэл. (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела:
(017) 3286904, 3286906
nv@promedia.by
http://www.nv-online.info http://twitter.com/narodnaya_volya

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы:
63222, 632222
Заснавальнік і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, правa ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 06.02.2012 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 28340 экз. Заказ №570.